# ГАНАРОВЫ ГРАМАДЗЯНІН

Мудра і прадбачліва вырашыу той, хто ў ліку трох першых ганаровых грамадзян нашага горада побач з імем славутага маршала К. К. Ракасоўскага назваў імя настаўніка А. І. Мілеўскага. Без палкаводца не прыйшоў бы мір на нашу зямлю, а без настаўніка — не вырасці будучыні. Палкаводзец на полі бою змагаецца за ідэалы вялікай рэвалюцыі, а настаўнік кожны дзень, кожным сваім словам і ўчынкам выхоўвае ў дзіцяці Чалавека. Гэта менавіта ён росціць прадаўжальнікаў справы рэвалюцыі.

Што ж гэта за словы і ўчынкі, якія дапамаглі Альбіну Іванавічу выхоўваць вядомага паэта і вучонага, настаўніка і рабочага?

...1936-ы год. А. І. Мілеўскі, зусім малады, двццацігадовы настаўнік, працуе выкладчыкам фізікі Гомельскага вячэрняга рабфака. Вучні яго — часцяком старэйшыя, іншы раз ім і за трыццаць. І вось сярод іх з'яўляецца адзін, які неяк асабліва прыцягвае ўвагу. Па-першае, прыйшоў адразу на трэці курс, а па-другое, была ў ім сялянская разважлівасць, сур'ёзнасць, як бы цяпер сказалі, — мэтанакіраванасць. Ён убіраў у сябе веды, ён паглынаў іх. Гэта быў Дзмітрый Кавалёў. На чацвёртым курсе настаўнік і рабфакавец пасябравалі: вучань быў маладзейшы ўсяго на год. Але ўсё астатняе жыццё, пакуль працягвалася гэтая дружба, а закончылася яна толькі са смерцю Дзмітрыя Кавалёва, вучань звяртаўся ў пісьмах так: «Настаўнік мой, душэўны мой. блізкі чалавек — сябар Альбін Іванавіч!» На кнігах, якія дарыў, калі пачалі выдаваць яго вершы, — «Настаўніку майму, незабыўнаму, любімаму...»

Гэта было прыцягненне адзін' да аднаго, патрэба гаварыць з сябрам, бачыць яго. Як гэта вызначыць?

«Ёсць людзі самазадаволеныя. Калі да іх прыходзіць нават незаслужаная ўзнагарода, яны прымаюць яе як належнае, без хвалявання. Ёсць людзі сціплыя. Калі да такіх прыходзіць пашана і признанне іх заслуг, яны міжвольна пытаюцца: за што? І пачыкаюць прыдзірліва дапытваць саміх сябе, правяраючы ўсё сваё жыццё. Было такое і ў Мілеўскага. Ен нанава правяраў сябе». Так пісаў адзін з даследчыкаў гэтага незвычайнага жыцця.

У Альбійа Іванавіча галоўнай рысай заўсёды была дабрыня. А заўсёды, спрадвеку было вядома, што толькі яна выхоўвае, вабіць, гоіць. І такая яна была шчырая ў гэтым чалавеку, такая шчодрая, што кожны, адчуваў яе на сабе. І калі пасля вайны вярнуўся Альбін Іванавіч паранены і хворы і крышачку аддыхаўся, то яму прапанавалі пасаду дырэктара спецыяльнага дзіцячага дома у Васільеўцы. Як яму сказалі, там быў патрэбны не столькі дырэктар, колькі бацька. Сіроты ж былі ваеннага часу...

У адным з пасляваенных пісьмаў, калі пасля вялікага перапынку зноў аднавілася перапіска паміж А. І. Мілеўскім і Д. Кавалёвым. калі знайшлі яны адзін аднаго для доўгіх гадоў сяброўства, вучань пісаў: «Дарагі мой настаўнік Альбін Іванавіч! Ці памятаеце Вы мяне, Вашага студэнта Гомельскага вячэрняга політэхнічнага рабфака? Ці памятаеце Дзмітрыя Кавалёва? Нас было ў Вас многа. Усіх і не ўпомніць. А мы, па крайняй меры за сябе я ручаюся, Вас ніколі не забудзем...»

Яны цягнуліся да яго заўсёды. І асабліва, бадай, тады, калі станавіліся дарослымі. Таму што пачыналі адчуваць нейкую духоўную пустату, запоўніць якую быў здольны толькі ён. Тыя, хто жыве ў Гомелі, прыходзяць. Хто зрэдку, а хто эмаль штодня. Як Святлана Георгіеўна Багдановіч, яго вучаніца, прадаўжальніца яго справы у Гомельскай сярэдняй школе № 30. І цяпер ён і яны, былыя вучні, як ніколі адчуваюць сябе бацькам і дзецьмі. Альбін Іванавіч пастарэў, а дзеці, хавальнікі яго старасці, як і раней, — побач.

А якое свята яны наладзілі свайму настаўніку на 70-гадовы юбілей у сёлетнім маі! Сышліся і з'ехаліся, віншавалі, успаміналі.